Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
БДУКМ
__________ С.Л. Шпарло
«16» чэрвеня 2022 г.
Рэгістрацыйны № ВД-344/эвуч.

# КУЛЬТУРАЛОГІЯ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:
1-15 02 01 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (па напрамках);
1-16 01 06 Духавыя інструменты (па напрамках);
1-16 01 10 Спевы (па напрамках);
1-17 01 05 Рэжысура святаў (па напрамках);
1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках);
1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках);
1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках);
1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках);
1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках);
1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

2022

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасцях універсітэта, зацверджаных пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 78 ад 12.04.2022 і вучэбных планаў па напрамках спецыяльнасцей, спецыялізацыям.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*А.І. Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар культуралогіі, прафесар;

*Л.К. Кухто,* прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*А.І. Салікаў*, прафесар кафедры маладзёжнай палітыкі і сацыякультурных камунікацый установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», кандыдат культуралогіі, дацэнт;

*Т.М. Смолікова,* дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый і рэкламы ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 13 ад 25.05.2022);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 15.06.2022)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Узрастанне ў XXI стагоддзі ролі культуры як фактару сацыяльнага развіцця ўзмацніла даследчую цікавасць да культурнай праблематыкі. Адным з найважнейшых духоўных кампанентаў дзейнасці чалавека з’яўляецца культура, якая забяспечвае розныя сферы жыццядзейнасці грамадства. У культуры знаходзяць праяўленне дыферэнцыраванасць і сістэмнасць грамадскага жыцця, якія падтрымліваюць адзінства грамадства, пераемнасць і яго развіццё. Аналіз пераважаючых у грамадстве духоўных каштоўнасцей дае магчымасць вызначыць узровень яго развіцця. У сучасную тэхнакратычную эпоху асабліва важна ўсвядоміць значэнне такіх феноменаў культуры як мараль, філасофія, рэлігія, мастацтва. Пазнанне культуры як грамадскай з'явы дае магчымасць растлумачыць многія працэсы духоўнага і сацыяльнага жыцця. Разуменне працэсаў, якія адбываюцца ў культурным і грамадскім жыцці, з'яўляецца сёння важнай умовай прыняцця сацыяльна значных рашэнняў, паспяховай прафесійнай дзейнасці ў розных галінах. Веды дынамікі сацыякультурнага жыцця забяспечваюць сучаснаму чалавеку адаптацыю ў хутказмяняльным свеце.

Культуралогія – гэта навуковая дысцыпліна, якая фармуе філасофскае ўяўленне аб сутнасці культуры; аб своеасаблівасці культурна-гістарычнага працэсу і каштоўнасці быцця чалавека.

Культуралогія адыгрывае важную ролю ў фарміраванні ўяўленняў аб прафесійнай культуры, дазваляе ўсвядоміць маральныя і сацыякультурныя падставы розных відаў прафесійнай дзейнасці, зразумець супярэчнасць паміж чалавекам і прыродай, чалавекам і тэхнікай, веданне законаў функцыянавання і развіцця культуры дапамагае чалавеку арыентавацца ў сацыякультурнай сітуацыі.

Культуралогію разумеюць як інтэгратыўную навуку, якая ўзнікла на стыку філасофіі культуры, гісторыі, псіхалогіі, сацыялогіі, этнаграфіі, антрапалогіі, мастацтвазнаўства, мовазнаўства, рэлігіязнаўства і іншых навук. Культуралогія сінтэзуе веды розных навук аб культуры ў цэласную сістэму, фармуючы ўяўленні аб сутнасці, функцыях, структуры і дынаміцы культуры, аб развіцці чалавечай цывілізацыі, аб прыродзе запатрабаванняў і каштоўнасцяў культуры. Культуралогія разглядае культуру ў яе канкрэтных формах, вывучае ўзаемадзеянне элементаў культуры: традыцый, норм, культурных кодаў. Яна апісвае, класіфікуе і тлумачыць феномен культуры ў сукупнасці яго каштоўнасна-сэнсавых, нарматыўна-рэгулятыўных і знакава-камунікатыўных характарыстык.

Культуралагічнае веданне валодае цэласнасцю і сістэмнасцю, яно адкрывае агульныя асновы разнастайных фактаў культуры, тлумачыць

парадак іх сістэмаўтварэння і ўзаемадзеяння, вызначае арыенціры і спосабы паводзін у розных сітуацыях у сацыякультурнай практыцы. У сувязі з гэтым асаблівае значэнне набывае сістэматычнае і планамернае вывучэнне студэнтамі ўстаноў вышэйшай адукацыі «Культуралогіі» – адной з базавых дысцыплін у сістэме вышэйшай культуралагічнай адукацыі.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Культуралогія» разлічана на студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі і ўлічвае папярэдне атрыманыя веды па гуманітарных дысцыплінах («Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», «Сучасная палітэканомія», «Паліталогія», модулю «Гісторыя мастацтваў», «Этнаграфія, міфалогія і фальклор беларусаў» і інш.), веданне ў цэлым асаблівасцей культурна-гістарычных эпох і атрыманне пэўных звестак па розных відах мастацтва. У вучэбнай праграме прадугледжана актуалізацыя міжпрадметных сувязей па такім вучэбным дысцыплінам, як «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці», «Беларуская літаратура», «Сусветная літаратура», «Этнаграфія, міфалогія і фальклор беларусаў», «Філасофія», «Педагогіка» і інш.

*Мэты вучэбнай* дысцыпліны – фарміраванне ў студэнтаў навуковага падыходу да вывучэння з'яў культуры, які грунтуецца на разуменні навуковай карціны свету, паглыбленне сістэмы ведаў па тэорыі і гісторыі культуры і асноўных праблем сучаснай культуралогіі.

Важнейшымі *задачамі* вучэбнай дысцыпліны з'яўляюцца:

– вызначыць месца культуралогіі ў сістэме сучасных гуманітарных навук;

– сфарміраваць у студэнтаў сістэму ведаў аб культуры;

– прасачыць станаўленне і развіццё паняццяў "культура" і "цывілізацыя";

– вызначыць месца і ролі культуры ў цэлым і яе асноўных структурных элементаў у дынаміцы развіцця;

– сфарміраваць у студэнтаў сістэму ведаў аб відах, формах і тыпах культур;

– выявіць ўсеагульныя заканамернасці функцыянавання культуры;

– разгледзець погляды на месца культуры ў соцыуме і ўяўленні аб сацыякультурнай дынаміцы;

– разгледзець гісторыка-культурны асаблівасці культуры і вылучыць дамінантныя каштоўнасці, ідэалы і сэнсы, якія складаюць яе гісторыкакультурную своеасаблівасць;

– сфарміраваць патрэбнасць у захаванні культурна-гістарычнай спадчыны свайго народа ва ўсіх яе формах, імкненне яе памнажаць і перадаваць будучым пакаленням.

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны «Культуралогія» студэнты павінны *ведаць:*

– марфалогію і функцыі культуры;

– формы праяўлення культуры ў розных сферах грамадскага жыцця;

– характэрныя асаблівасці розных тыпаў культуры, у тым ліку сучаснай айчыннай культуры;

– канцэпцыі дынамікі культуры;

– асноўныя этапы развіцця культуры ў кантэкце сусветнай гісторыі чалавецтва;

– асноўныя культурныя дасягненні пэўных рэгіёнаў і народаў;

– абумоўленасць глабальных праблем сучаснасці станам культуры;

– характар узаемадзеяння культур і тэндэнцыі сучаснага сусветнага культурнага развіцця.

*Студэнты павінны ўмець:*

– прымяняць атрыманыя ў працэсе вывучэння дысцыпліны культуралагічныя веды ў прафесійнай дзейнасці;

– выкарыстоўваць прынцыпы і метады культуралогіі для ацэнкі розных культурных з'яў і працэсаў;

– асэнсоўваць значэнне культуры як індыкатара стану грамадства;

– аналізаваць артэфакты з семіятычнага, аксіялагічнага пунктаў гледжання;

– крытычна ўспрымаць разнастайныя з’явы культуры ў іх суаднесенасці з іншымі сферамі сацыяльнай жыццядзейнасці;

– аргументавана выкладаць свае погляды і меркаванні па праблемах культуры;

– ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця сучаснай культуры;

– прагназаваць, планаваць і ажыццяўляць дзейнасць у галіне культуры.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартамі вышэйшай адукацыі ОСВО-2022 па спецыяльнасцях універсітэта у выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Культуралогія» студэнты павінны набыць наступныя *універсальныя кампетэнцыі:*

– Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, этнічныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні.

– Валодаць гуманістычным светапоглядам, якасцямі грамадзянскасці і патрыятызму

– Валодаць здольнасцю аналізаваць працэсы дзяржаўнага будаўніцтва ў розныя гістарычныя перыяды, выяўляць фактары і механізмы гістарычных змен, вызначаць сацыяльна-палітычнае значэнне гістарычных падзей (асоб, артэфактаў і сімвалаў) для сучаснай беларускай дзяржаўнасці, у дасканаласці выкарыстоўваць выяўленыя заканамернасці ў працэсе фарміравання грамадзянскай ідэнтычнасці.

Таксама студэнты павінны набыць наступныя *базавыя прафесійныя кампетэнцыі:*

– Аналізаваць гісторыка-культурны працэс, разумець заканамернасці фарміравання культурна-творчых характарыстык асобы, ладу думкі і дзейнасці чалавека, які жыве ў гістарычна канкрэтным грамадстве.

– Аналізаваць этнакультурную спецыфіку традыцыйнай культуры Беларусі, этнічных працэсаў у Беларусі і ў сучасным свеце.

*Метады (тэхналогіі) навучання.* Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія спрыяюць уключэнню навучэнцаў да пошуку і выкарыстанню ведаў, набыццю вопыту самастойнага рашэння задач, адносяцца: тэхналогіі праблемна-модульнага навучання; тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці; праектныя тэхналогіі; камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады); метад аналізу канкрэтных сітуацый; гульнявыя тэхналогіі. У мэтах фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускніка ВНУ ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Для кіравання навучальным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай работы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі па спецыяльнасцях універсітэта на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Культуралогія» для дзённай формы атрымання адукацыі ўсяго прадугледжана 110 гадзін, з якіх аўдыторных заняткаў – 70 гадзін. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 56, семінары – 14. Для завочнай формы атрымання адукацыі ўсяго прадугледжана 110 надзін, з якіх 16 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відам заняткаў: лекцыі – 8 гадзін, семінарскія заняткі – 8 гадзін.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Раздзел І. Тэорыя культуры

### *Тэма 1. Уводзіны*

Значэнне вучэбнай дысцыпліны "Культуралогія" у сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў сацыякультурнай сферы. Прадмет, змест і стуктура вучэбна1 дысцыпліны. Міжпрадметныя сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Віды вучэбных заняткаў і формы кантролю. Крыніцы і літаратура па праблемах вучэбнай дысцыпліны. Культуралогія як экспліцытная форма ведаў аб феноменах культуры. Гісторыя, перадумовы і прычыны станаўлення і развіцця культуралагічных ведаў. Метады культуралагічнага даследавання. Сістэма катэгорый культуралогіі. Галіны культуралогіі: фундаментальная культуралогія, сацыяльная культуралогія, псіхалогія культуры, прыкладная культуралогія, культурная семіётыка.

### *Тэма 2. Узнікненне і развіццё культуралагічных ведаў на розных этапах існавання грамадства*

Генезіс і развіццё ўяўленняў аб культуры. Этымалогія канцэпту «культура». Разуменне культуры ў антычным грамадстве. Уяўленне сутнасці культуры ў працах філосафаў Сярэднявечча (К. С. Ф.Тэртуліяна, Аўгусціна Блажэннага, Фамы Аквінскага).

Дасягненне культуралагічнай думкі ў эпоху Адраджэння. Погляды на культуру М. Мантэня, Э. Ратэрдамскага, М. Кузанскага, Т. Кампанелы.

Культуралагічныя веды ў эпоху Асветніцтва. Паглыбленне поглядаў на культуру ў працах Р. Дэкарта, Дж. Лока, Ф. Бэкана, Дж. Віко, Ж. Ж. Русо, Вальтэра, Т. Гобса.

Развіццё культуралагічных ведаў у індустрыяльным грамадстве. Культуралагічная праблематыка ў працах І. Канта, Г. В. Ф. Гегеля, Ф. Ніцшэ і іншых філосафаў.

Трактоўка культуралагічных праблем у ХХ ст. Феномен духоўнага фарміравання асобы ў працах рускіх філосафаў. Экзістэнцыяльная культурфіласофія. Постмадэрнісцкая трактоўка культуралагічных праблем.

### *Тэма 3. Разнастайнасць падыходаў, кірункаў і школ у разуменні культуры*

Разнастайнасць азначэнняў культуры як адлюстраванне складанасці і шматзначнасці самога феномена. Асноўныя катэгорыі культуры: прастора, час, чалавек - універсальны кантэкст культуры. Каштоўнасныя і пазітывісцкія падыходы да культуры. Ідэі крэацыянізму, катастрафізму і эвалюцыянізму. Ідэі

эвалюцыянізму і дыфузіянізму як аналітычны інструмент вывучэння культуры. Сімвалічны інтэракцыянізм. Марксісцкая канцэпцыя культуры. Цывілізацыйная школа як вывучэнне культурных макрасупольнасцей. Псіхааналітычныя канцэпцыі культуры.

Франкфурцкая школа ў культуралогіі. Крытыка прагрэсісцкай лініі развіцця культуры. Амерыканская антрапалагічная школа. Культурна-гістарычная школа. Гульнявая мадэль культуры. Структуралісцкая версія.

### *Тэма 4. Духоўная культура і яе сутнасць.*
### *Матэрыяльная культура: крытэрыі і змест*

Сутнасць духоўнасці. Разнастайнасць духоўнага жыцця чалавека. Духоўна-сімвалічны характар культуры. Вызначэнне паняцця «духоўная культура». Міфалогія, рэлігія, мастацтва, навука (філасофія) як асноўныя формы духоўнай культуры. Прыярытэты духоўнай культуры. Функцыі духоўнай культуры: інфармацыйная, ментальная, знакава-сімвалічная, эстэтычная і інш.

Матэрыяльная культура – аснова духоўнай. Умоўны падзел культуры на матэрыяльную і духоўную. Крытэрыі і прыметы матэрыяльнай культуры. Катэгорыі матэрыяльнай культуры: пароды жывёл, гатункі раслін, культура глебы, будынкі і збудаванні, шляхі зносін і транспартныя сродкі, інструменты, прыстасаванні, абсталяванне, сувязь і сродкі сувязі, тэхналогія.

Фундаментальныя структурныя пераўтварэнні відаў матэрыяльнай культуры ў XX – пачатку XXI ст.

### *Тэма 5. Тыпалогія культуры.*
### *Важнейшыя тыпалагічныя мадэлі культуры*

Паняцце тыпу культуры і тыпалогіі. Тыпалагізацыя як спосаб асэнсавання сацыякультурнай прасторы і як навуковы метад даследавання культуры. Разнастайнасць тыпалагічных пабудоў культуры як адлюстраванне яе шматфункцыянальнасці і разнастайнасці формаў. Крытэрыі і падставы для тыпалагічнай класіфікацыі культуры.

Этнаграфічныя крытэрыі (антрапалагічныя, лінгвістычныя, геаграфічныя, гаспадарча-бытавыя і да т.п.). Культурна-гаспадарчыя тыпы. Гістарычная тыпалагізацыя культуры. Прасторава-рэгіянальны (заходне-еўрапейская, араба-мусульманская, усходняя, індыйская, лаціна-амерыканская і г. д.). Паняцце нацыянальнай культуры. Рэлігійны крытэрый; хрысціянскі, мусульманскі, канфуцыянска-даасісцкі, інда-будысцкі тыпы культуры.

Сацыялагічныя крытэрыі. Дыферэнцыяцыя культуры на субкультуры па прынцыпе сацыяльнай спецыфікі яе носьбітаў. Маргінальны характар субкультур. Праблема контркультуры.

Сучасныя тыпалагічныя класіфікацыі культуры: традыцыяналісцкія і інавацыйна-авангардныя субкультуры. Дыхатамія "Усход — Захад".

Праблема тыпалогіі ў фундаментальнай культуралогіі (М. А. Бярдзяеў, Ф. Ніцшэ і інш.).

Адзінства ўнутранага, псіхалагічнага ладу калектыўнай душы народа – аснова тыпалагічнай мадэлі О. Шпенглера. Прасімвал культуры. Тыпы культуры паводле О. Шпенглера.

Класіфікацыя культур М. Я. Данілеўскім. Дзейнасная прырода культуры. Славянскі культурна-гістарычны тып культуры і яго патэнцыял.

Культурна-гістарычная канцэпцыя К. Ясперса. Сутнасць паняцця «восевы час». Праметэеўскі тып культуры. Гуманістычная культура восевага часу.

Канцэпцыя цыклічнага развіцця культуры П. А. Сарокіна. Ідэацыйны, сенсітыўны і ідэалістычны тыпы культуры. М. Мід аб асаблівасцях узаемадзеянняў пакаленняў.

«Драўняная культура» і «культура рызомы» (Ж. Дэлёз, Ф. Гватары). Характарыстыка традыцыяналісцкага і тэхнагеннага тыпаў культуры.

### *Тэма 6. Культура сацыяльных супольнасцей. Спецыфіка масавай культуры*

Характэрныя рысы элітарнай і народнай культуры. Эліта як вышэйшы слой сацыяльнай структуры грамадства. Ідэя элітарнасці культуры ў працах М.А.Бярдзяева. Агульныя рысы, асаблівыя якасці і каштоўнасна-псіхалагічныя ўстаноўкі эліты. Нефармальная ўлада эліты.

Характэрныя рысы элітарнай культуры. Карпаратыўны характар элітарнай культуры. Духоўны арыстакратызм. Эстэтычная свабода. Глыбіня зместу і арыгінальнасць. Вытанчанасць формы. Наватарства. Індывідуальны пачатак і камерцыйная незалежнасць.

Народная культура як гістарычная аснова прафесійнай культуры. Роля народнай культуры ў ідэнтыфікацыі і самазахаванні этнасу. Этнас як суб’ект народнай культуры. Індывідуальныя, групавыя, масавыя элементы народнай культуры. Функцыі народнай культуры: эстэтычная, выхаваўчая, утылітарна-практычная, абрадавая і інш.

Ананімны, калектыўны, непрафесійны характар народнай культуры. Віды і формы народнай культуры. Творчыя стасункі і ўзаемадачыненні народнай і элітарнай культур.

Ірацыянальнасць масавых рухаў і масавай свядомасці. Уплыў НТР, урбанізацыі, разбурэння лакальных супольнасцей і сацыяльных меж на фарміраванне масавай культуры. Масавая культура як прадукт постіндустрыяльнага тыпу тэхналагічнага развіцця. Месца сучасных сродкаў камунікацыі і павышэння ўзроўню адукаванасці мас у дынаміцы масавай культуры. Дэмакратызацыя грамадства як каталізатар масавай культуры. Наркатычны характар масавай культуры. Прымітывізацыя чалавечых адносін, прыярытэт у маскульце грошай, поспеху, прапаганда канфармізму, жорсткасці, насілля, сексу. Натуралізм як рыса масавай культуры. Сэнсавы дыяпазон масавай культуры. Асноўныя жанры масавай культуры.

### *Тэма 7. Дынаміка культуры*

Культура як працэс. Устойлівае і зменлівае ў культуры. Разнастайнасць форм і механізмаў культурных змяненняў. Паняцце «культурная дынаміка» і дэтэрмінанты культурных змяненняў, мадыфікацыя рыс культуры ў прасторы і часе. Флуктацыя культуры (П. А. Сарокін «Сацыяльная і культурная дынаміка»). Інфармацыйная тэорыя адаптацыі Т. Парсанса.

Асноўныя канцэпцыі культурнай дынамікі: працоўная тэорыя марксізму, сінергетычная парадыгма «сістэмнага эфекту», тэорыя канфлікту, псіхааналітычны падыход да культурнай зменлівасці і інш. Лінейна-паступальныя, хвалепадобныя, цыклічныя, інверсійныя, выбуховыя змяненні (Ю. М. Лотман «Культура і выбух»).

Дынаміка ўнутраных працэсаў, іх узаемадзеянне з культурнай падзеяй. Важнейшыя культурныя працэсы: параджэнне культурных феноменаў; іх міжпакаленная трансляцыя і прастора культурнага свету; іх зменлівасць.

Крыніцы і тыпы культурных змен у шматмернай прасторы. Традыцыя як крыніца культурнай дынамікі. Грамадскі характар традыцыі. Агульнаславянскія вытокі беларускіх культурных традыцый. Культурная інавацыя і шляхі яе ўзнікнення. Культурныя мутацыі. Этапы ўкаранення культурнай інавацыі: адбор, мадыфікацыя, інтэграцыя. Узаемадзеянне традыцый і навацый.

Запазычанні як від культурнай дынамікі. Псіхасацыяльныя фактары прыняцця і адмаўлення культурных запазычанняў.

Культурная дыфузія і яе напрамкі. Аналіз часавых, прасторавых характарыстык культур Ф. Грэбнерам, Ф. Ратцэлем, Л. Фрабеніусам, К. Уіслер. Механізмы культурных дыфузій. Гарызантальная і вертыкальная дыфузія.

### *Тэма 8. Культура і цывілізацыя*

Сутнасць цывілізацыі і яе ўзаемаадносіны з культурай. Разнастайнасць тэарэтычных падыходаў да сутнасці цывілізацыі. Цывілізацыя і варварства.

Цывілізацыя як грамадства роўнасці і справядлівасці. Разуменне цывілізацыі як універсальнага, няўхільнага, паступальнага руху. Цывілізацыя як матэрыяльная аснова культуры. Цывілізацыя як сістэма сацыякультурных структур, інстытутаў і прадуктаў чалавечай працы. Характар цывілізацыі: прагматычны, «плебейскі». Сферы цывілізацыі: матэрыяльнае багацце, вытворчасць, тэхніка, дабрабыт і камфорт, сістэма дзяржавы і права. Узаемадзеянне і ўзаемаўплыў культуры і цывілізацыі. Духоўна-сімвалічны характар культуры. М. А. Бярдзяеў аб паходжанні культуры.

Стадыі і тыпы цывілізацый. Аграрна-традыцыйная цывілізацыя і яе характарыстыка. Індустрыяльная, або тэхнагенная, цывілізацыя і яе мэты. Постіндустрыяльная цывілізацыя і яе адметнасці. Фарміраванне глабальнай цывілізацыі і яе негатыўныя і пазітыўныя наступствы. А. Тофлер, Ф. Фукуяма, С. Ф. Хантынгтон аб сцэнарыях развіцця цывілізацый.

Цывілізацыі Захаду і Усходу і іх узаемадачыненні.

## Раздзел II. Гісторыя культуры

### *Тэма 9. Культура першабытнага грамадства*

Навуковыя падыходы і кірункі даследавання антрапасацыягенезу і генезісу культуры. Фарміраванне культуры як універсальнага механізма самаарганізацыі і грамадскага жыцця.

Станаўленне першабытнай культуры. Архаічны (даміфалагічны) светапогляд. Татэмізм як адна з найбольш старажытных форм вераванняў (эпохі палеаліту). Анімізм, фетышызм як тып светаадчування дагістарычнай эпохі. Міфалогія і яе значэнне. Рытуал і яго функцыі ў першабытным грамадстве. Узнікненне пахавальных абрадаў і культ продкаў. Дасягненні неалітычнай рэвалюцыі. Курганна-мегалітычная культура V–I тыс. да н.э. у Еўразіі.

Вобраз свету першабытнага чалавека (час, прастора, самаадчуванне). Асноўныя рысы першабытнай культуры. Фарміраванне традыцыі як сродку акумуляцыі і трансмісіі жыццёвага вопыту.

Першабытнае мастацтва. Пячорнае і наскальнае выяўленчае мастацтва (Альтаміра, Ляско, Мантэспан, Тасілі, Чатал-Гуюк і інш.). Помнікі першабытнай культуры на тэрыторыі Беларусі.

### *Тэма 10. Культура старажытных усходніх цывілізацый. Культура Старажытнага Егіпта*

Культура Месапатаміі. Культурна-гістарычныя арэалы Усходу: Старажытная Месапатамія, Старажытны Егіпет. Характэрныя рысы старажытных цывілізацый: адаптацыя да прыроды, патрыярхальнасць,

іерархічнасць, аўтарытарнасць, статычнасць, інтраверсія, абстрактнасць мыслення. Спецыфіка разумення асобы на Усходзе.

Перыядызацыя культуры Старажытнай Месапатаміі. Містыцызм і «Магічная душа» ў культуры Месапатаміі (О. Шпенглер, М. Эліадэ). Культ лёсу. Развіццё рэлігійных уяўленняў. Пантэон багоў.

*Шумерская цывілізацыя.* Міфалогія шумераў. Узнікненне і развіццё пісьменнасці. Асноўныя дасягненні ў навуцы і тэхналогіях. Архітэктура шумераў (зікураты). Зараджэнне пісьменнай і прававой думкі ў Месапатаміі.

*Вавілонскае царства.* Дасягненні ў будаўніцтве дзяржавы, права. Літаратурныя творы. Развіццё навукі. Вавілон – шэдэўр горадабудаўніцтва. Вавілонская башня. «Эпас пра Гільгамеша» як літаратурны помнік старажытнасці.

Вісячыя сады Семіраміды.

«Законы Хамурапі» – старажытны помнік прававой думкі. «Ідэя таліёна».

*Асірыя.* Арганізацыя войска. Сталіца дзяржавы – горад Ніневія. Роспісы і барэльефы. Бібліятэка цара Ашурбаніпала. Асірыйскі этнас у гісторыі.

*Культура Старажытнага Ірана. Арыяна.* Авеста – найбольш старажытная свяшчэнная кніга чалавецтва. Асаблівасці рэлігіі зараастрызму.

*Культура Персіі імперскага перыяду.* Фарміраванне імперыі Кіра. Шэдэўр горадабудаўніцтва – сталіца Персіі горад Персепаль.

Адметныя асаблівасці старажытнаегіпецкай цывілізацыі. Старажытнаегіпецкая культура як вынік прыстасавання да прыродна-кліматычных умоў (А. Д. Тойнбі). Піраміда як прасімвал егіпецкай культуры. Культ памерлых. Грабніца Тутанхамона – дасягненні ў дэкаратыўным мастацтве. Роспісы грабніц. Час як важнейшая катэгорыя свядомасці егіпцян. Рэлігійная рэформа фараона Эхнатона. Мастацтва эпохі Эхнатона. Асноўныя выяўленчыя каноны. Шэдэўры скульптуры. Літаратура Старажытнага Егіпта. Храмы і скульптуры эпохі Рамсесаў: Луксор, Карнак.

*Егіпет эпохі элінізму.* Характарыстыка эпохі. Александрыя як культурны цэнтр. Александрыйская філалагічная школа. Александрыйскі маяк – адно з цудаў свету.

Рымскі перыяд у развіцці культуры Егіпта.

Развіццё навуковых ведаў (матэматыка, астраномія, медыцына, ваенная справа і інш.).

## ***Тэма 11. Культура Старажытнага Кітая і Старажытнай Індыі***

Перыядызацыя старажытнакітайскай культуры. *Перыяд архаікі.* Культура першых дзяржаў. Эпоха Чжоу – «сто школ» у філасофіі Кітая.

*Перыяд класікі.* Утварэнне імперыі Цынь. Імперыя Хань – залаты век імперыі.

*Эпоха шасці дынастый.* Рост уплыву будызму на развіццё кітайскай культуры.

Традыцыяналізм кітайскай культуры. Канцэпцыя сярэдзіннай дзяржавы. Культ імператара і продкаў. Сямейна-этнічныя адносіны.

Асноўныя філасофска-рэлігійныя вучэнні Старажытнага Кітая: даасізм, канфуцыянства, маізм. Паняцці «дао», «Інь» і «Янь» як аснова гармоніі свету. Даоскія тэхнікі самаўдасканалення. Канфуцыянская мараль і мадэль ідэальнага чалавека. Прынцып гармоніі ў канфуцыянстве. Будыйская маральная традыцыя.

Рацыянальнасць мыслення як адметнасць кітайскага менталітэту. Навуковыя дасягненні. Стварэнне іерагліфічнай пісьменнасці. Кітайскі каляндар. Дасягненні кітайскай медыцыны. Мастацтва Старажытнага Кітая (літаратура, выяўленчае мастацтва, дойлідства, музыка, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва). Звычаі і абрады. Сістэма адукацыі і выхавання.

Гістарычныя тыпы індаарыйскай цывілізацыі. Протаіндыйская культура, індаарыйская культура, культура дынастыі маўр’яўскага грамадства. Варна-каставая сістэма. Развіццё міфалагічных, рэлігійных, філасофскіх уяўленняў аб свеце. Вучэнне аб душы, карме і сансары. Брахмаізм, будызм, індуізм – асноўныя філасофска-рэлігійныя вучэнні. Аморфнасць індуізму. Рэлігійны плюралізм. Важнейшыя прынцыпы будызму. Паняцце нірваны. Махаяна і Хінаяна. Мастацкая культура Старажытнай Індыі. Веды – рэлігійна-філасофскі помнік. «Махабхарата» і «Рамаяна» – шэдэўры літаратуры сусветнага значэння. Значэнне танца ў індыйскай культуры. Пячорныя гарады і храмавыя комплексы. Прававая культура (Закон Ману). Развіццё навукі і тэхнікі (астраномія, матэматыка, медыцына і інш.). Камасутра – энцыклапедыя сямейных адносін і сексуальнага жыцця.

### *Тэма 12. Культура Старажытнай Грэцыі і Рыма*

Перыядызацыя старажытнагрэчаскай культуры. *Крыта-мікенскі перыяд.* Рассяленне старажытных этнасаў у III–II тыс. да н.э. па Еўропе і Міжземнамор’і. Фарміраванне грэчаскай міфалогіі. Мінойская культура вострава Крыт. Абшчынна-родавая культурная спадчына ў культуры Грэцыі. Уяўленні аб культурнай дынаміцы.

*Антычная Грэцыя перыяду архаікі.* Палісная сістэма дзяржаўнасці. Алімпійскія гульні. Міфалогія антычнай Грэцыі. Апалонаўскае і дыянісійскае ў культуры. Элінскі эпас. Праблема спалучэння рацыянальнасці і містыкі. Ідэя «парадку» і прынцып «меры».

*Антычная Грэцыя перыяду класікі.* Палітычная культура старажытных грэкаў. Класічны перыяд у гісторыі філасофіі (Сакрат, Платон, Арыстоцель). Скульптары эпохі класікі. Сямейныя адносіны і быт грэкаў.

*Культура элінізму.* Сінтэз мастацтва Захаду і Усходу. Інтэнсіўнасць развіцця мастацтва. Асноўныя дасягненні эпохі.

Перыядызацыя старажытнарымскай культуры: этрускі і царскі перыяды; перыяд рэспублікі; перыяд імперыі. Уплыў грэчаскай культуры на рымскую цывілізацыю. «Civitas» як падмурак рымскай культуры. Своеасаблівасць карціны свету ў Старажытным Рыме. Каштоўнасці рымскай супольнасці. Канцэпт лёсу (фатуму) у сістэме каштоўнасцей рымлян.

Міфалагізацыя гісторыі як характэрная рыса рымлян. Пантэон Рыма. Крызіс старажытнарымскай рэлігіі. Хрысціянства як сінтэз іўдзейскай і антычнай культурных традыцый.

Палітычная і прававая культура Рыма (Г. Ю. Цэзар, М. Т. Цыцэрон, Палібій і інш.). Рымская філасофская школа (Марк Аўрэлій, Луцый Сенека і інш.). Стаіцызм. Уплыў культуры Рыма на станаўленне заходняй цывілізацыі. Раннехрысціянскае мастацтва і сімволіка.

### *Тэма 13. Еўрапейская культура эпохі Сярэднявечча*

Паняцце Сярэднявечча і яго інтэрпрэтацыя ў еўрапейскай гуманітарнай думцы (Ф. Ніцшэ, Ё. Хёйзінга, М. Блок, Ф. Бродэль, Ж. Ле Гоф і інш.). Перыядызацыя еўрапейскай сярэдневяковай культуры: ранняя, сталая, позняя. Хрысціянства як каштоўнасна-сімвалічная аснова культуры Сярэднявечча. Узнікненне хрысціянскай тыпалогіі культуры і яе роля ў станаўленні хрысціянскага тыпу культуры (Іаан Златавуст, св. Аўгусцін, Фама Аквінскі і інш.).

Адметнасць сярэдневяковай карціны свету. Храм як «вертыкаль духу»; горад як «гарызанталь гісторыі». Ідэя ўсеагульнай любові. Боскае адкрыццё як аснова пазнання свету. Ідэя асабістага выратавання веруючага. Хрысціянская сатэрыялогія – вучэнне аб выратаванні. Дуалізм сярэдневяковай свядомасці: горні свет і дольны свет.

Субкультуры Сярэднявечча: хрысціянская, рыцарская, бюргерская, вясковая, варварская. Узаемасувязь рэлігійнай, арыстакратычнай і народнай культуры.

Мастацкая сярэдневяковая культура. Раманскі і гатычны стылі і іх адметныя рысы. Хрысціянскі канон. Хрысціянская іканаграфія. Мазаікі і фрэскі. Кніжная мініяцюра. Помнікі архітэктуры: саборны ансамбль у Пізе, царква Нотр-Дам дзю Пор у Клермон-Феране, сабор Парыжскай Божай Маці і інш. Музычнае мастацтва: грыгарыянскі харал, поліфанія, чатырохлінейны нотны стан. Літаратура: эпас, літургічная драма, раман, куртуазная паэзія.

Сярэдневяковы тэатр: містэрыя, фарс, міракль. Народная карнавальная культура як «іншае жыццё народа на аснове смеху». Станаўленне адукацыі. Узнікненне першых універсітэтаў.

Сярэдневяковая беларуская культура. Хрысціянскі гуманізм беларускіх асветнікаў: Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Клімент Смаляціч, Аўраамій Смаленскі. Школы дойлідства на беларускіх землях. Помнікі архітэктуры: Сафійскі сабор у Полацку, гродзенская царква Барыса і Глеба, царква Благавешчання ў Віцебску і інш. Манументальны і станковы жывапіс. Дробная пластыка. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Сістэма адукацыі і выхавання. Царкоўныя і манастырскія школы.

### *Тэма 14. Культура эпохі Адраджэння і Рэфармацыі*

Сацыяльна-эканамічныя перадумовы ўзнікнення культуры Рэнесансу. Тыпы рэнесансных культур: італьянскае Адраджэнне, Паўночнае Адраджэнне, Няпоўнае Адраджэнне (Англія, Партугалія, Чэхія, Польшча). Протарэнесанс, Ранні Рэнесанс, Высокі Рэнесанс, Позні Рэнесанс. Змяненне тэацэнтрычнага светапогляду на гомацэнтрычны. Новая інтэрпрэтацыя традыцыйных хрысціянскіх догматаў. Засваенне антычнай культурнай спадчыны. Ідэалы і каштоўнасці рэнесансных гуманістаў. Ідэал гармоніі чалавека і космасу.

Мастацтва як увасабленне новай карціны свету. Італьянскія жывапісныя школы. Творчасць Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла, Тыцыяна, Батычэлі, Рафаэля, Альбрэхта Дзюрэра, Іераніма Босха і інш. Ман'ерызм як стыль Рэнесансу. Адлюстраванне ў тэатральным мастацтве гуманістычных ідэй і супярэчнасцей эпохі (У.Шэкспір). Адраджэнне камедый, трагедый, пастаралей. La commedia erudite і камедыя дэль артэ.

Музычнае мастацтва: ars antigua, ars nova. Нідэрландская поліфанічная школа. Развіццё народнай песеннай творчасці і інструментальная музыка. Фларэнтыйская камерата.

Асаблівасці літаратуры Рэнесансу. «Кніга песень» Ф. Петраркі. Рэнесансная навела Д. Бакачыа, Л. Арыоста. Рэалістычна-фантастычныя раманы Ф. Рабле, М. Сервантэса.

Асноўныя дасягненні ў галіне навукі і іх уплыў на духоўную культуру. Светапоглядныя канцэпцыі С. Буднага, В. Цяпінскага, А. Волана і інш. Культуратворчая дзейнасць Ф. Скарыны. Станаўленне і развіццё беларускай мовы, пісьменнасці і літаратуры (М. Гусоўскі, Я. Вісліцкі).

Пашырэнне адукацыі. Брацкія школы. Езуіцкія калегіумы. «Граматыка» М. Сматрыцкага.

### *Тэма 15. Культура Новага часу*

Сацыяльна-палітычныя дэтэрмінанты фарміравання культуры Новага часу. Пераходны характар культуры – ад Сярэднявечча да Новага часу. Класіцызм. Барока як стыль эпохі. Навуковая рэвалюцыя. Культ навукі і тэхнікі. Секулярызацыя культуры і быту. Асвета як ідэалогія буржуазіі. Пратэстантызм і яго роля ў фарміраванні капіталістычных адносін (М. Вэбер).

Філасофія Новага часу. Асветніцкія ідэі Д. Дзідро, Вальтэра, Ж. Ж. Русо і інш. Асноўныя мастацкія напрамкі. Культура ракако. Мастацтва Францыі, Англіі, Іспаніі, Германіі. Венская школа ў музыцы. Фламандская школа жывапісу.

Культура Захаду ў XIX ст.: агульная характарыстыка эпохі. Эпоха рамантызму. Ідэалы і сімвалы рамантызму ў мастацтве. Стагоддзе літаратуры, музыкі, тэатра. Стыль ампір. Новыя напрамкі ў архітэктуры. Містычны элемент рамантызму (У. Блэйк). Эскапісцкія ідэі рамантызму (Дж. Г. Байран і інш.). Цікавасць да культур Усходу і народнай культуры.

Пошукі рэалістычнага мастацтва. Эстэтычныя ідэалы рэалізму. Адлюстраванне рэалій буржуазнай культуры. Імпрэсіянізм у культуры Еўропы.

Дэкаданс. Культурфіласофская рэфлексія Ф. Ніцшэ. Стыль мадэрн. Мадэрнізм – інавацыйна-крэатыўны тып культурнага светабачання. Авангардныя напрамкі ў культуры як адлюстраванне супярэчнасцей быцця Еўропы (кубізм, сімвалізм, сюррэалізм, футурызм, экспрэсіянізм і інш.).

Беларуская культура XVII–XVIII стст. Грэка-каталіцкая царква і яе ўплыў на развіццё культуры. Асвета і адукацыя. Асветніцкая дзейнасць Сімяона Полацкага, М. Пачобута-Адляніцкага, Л. Залускага, Я. Даманеўскага, Б. Дабашэвіча і інш.

Фарміраванне дэмакратычнай ідэалогіі і грамадскай думкі ў XIX ст. (К. Каліноўскі, А. Незабытоўскі, Ф. Савіч і інш.).

Мастацкая культура ў Беларусі. Віленскае барока, тэатр, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Вобраз рамантычнага героя ў творчасці А.Міцкевіча. Эстэтыка рамантызму ў паэзіі Т. Зана і Я. Чачота. Тэндэнцыя ўпарадкавання існуючага, а не яго пераўтварэння ў драматургіі В. Дуніна-Марцінкевіча. Прынцыпы рэалізму і народнасці ў творах Ф. Багушэвіча. Рамантычныя і рэалістычныя пачаткі ў паэзіі Я. Лучыны.

### *Тэма 16. Сацыядынаміка еўрапейскай культуры XX – пачатку XXI ст.*

Крызіс каштоўнасцей розуму, прагрэсу і самабытнасці свету ў познім індустрыяльным грамадстве. Культура мадэрну як пошук новых духоўных асноў быцця. Сацыяльна-палітычныя рухі леварадыкальнага і

праварадыкальнага зместу. Распад адзінства еўрапейскай культуры постіндустрыяльнага грамадства.

Масавае грамадства і культура. Тэхналагічныя і сацыяльныя дэтэрмінанты фарміравання масавай культуры. Механізм масавай культуры і яе функцый.

Феномен постмадэрнізму і яго адметныя ўласцівасці. Рост культурнай разнастайнасці. Узаемадзеянне культур, міжкультурная камунікацыя. Дыялог культур. Варыянты ўзаемадзеяння самабытнасці і сучаснасці.

Агульныя прынцыпы і каштоўнасці савецкай культуры. Уніфікацыя культурнага жыцця ў савецкім грамадстве. Дэструкцыя сацыялістычнай культуры. Сацыякультурнае фарміраванне постсавецкага грамадства.

Перадумовы фарміравання сусветнай культуры. Складванне планетарнай прасторы культуры. Праблема глабальных цэнтраў і перыферыі культуры. Полімарфізм культуры як фактар устойлівага развіцця сучаснага грамадства. Футуралогія аб глабальным мадэліраванні розных аспектаў сусветнай культуры.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
### для дзённай формы атрымання адукацыі

| № тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | усяго | лекцыі | семінарскія заняткі | | |
| **Раздзел I. Тэорыя культуры** | | | | | | |
| *1.* | Уводзіны | 2 | 2 | | | |
| *2.* | Узнікненне і развіццё культуралагічных ведаў на розных этапах існавання грамадства | 2 | 2 | | | |
| *3.* | Разнастайнасць падыходаў, кірункаў і школ у разуменні культуры | 3 | 2 | 1 | | |
| *4.* | Духоўная культура і яе сутнасць. Матэрыяльная культура: крытэрыі і змест | 5 | 4 | 1 | | |
| *5.* | Тыпалогія культуры. Важнейшыя тыпалагічныя мадэлі культуры | 5 | 4 | 1 | 1 | Тэст |
| *6.* | Культура сацыяльных супольнасцей. Спецыфіка масавай культуры | 2 | 2 | | 1 | Тэст |
| *7.* | Дынаміка культуры | 5 | 4 | 1 | 2 | Падрыхтоўка самастойных заданняў |
| *8.* | Культура і цывілізацыя | 2 | 2 | | 2 | Падрыхтоўка самастойных заданняў |
| **Раздзел II. Гісторыя культуры** | | | | | | |
| *9.* | Культура першабытнага грамадства | 3 | 2 | 1 | | |
| *10.* | Культура старажытных усходніх цывілізацый. Культура Старажытнага Егіпта | 3 | 2 | 1 | 2 | Падрыхтоўка прэзентацыі і дакладу па тэме |
| *11.* | Культура Старажытнага Кітая і Старажытнай Індыі | 5 | 4 | 1 | 1 | |
| *12.* | Культура Старажытнай Грэцыі і Рыма | 5 | 4 | 1 | 1 | |
| *13.* | Еўрапейская культура эпохі Сярэднявечча | 3 | 2 | 1 | 1 | |
| *14.* | Культура эпохі Адраджэння і Рэфармацыі | 3 | 2 | 1 | 1 | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| *15.* | Культура Новага часу | 3 | 2 | 1 | 1 | |
| *16.* | Сацыядынаміка еўрапейскай культуры XX – пачатку XXI ст. | 5 | 4 | 1 | 1 | |
| **Разам…** | | **56** | **44** | **12** | **14** | |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ
## для завочнай формы атрымання адукацыі

| № тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | усяго | лекцыі | семінарскія заняткі |
| **Раздзел І. Тэорыя культуры** | | | | |
| *1.* | Уводзіны | 0,5 | 0,5 | |
| *2.* | Узнікненне і развіццё культуралагічных ведаў на розных этапах існавання грамадства | 0,5 | 0,5 | |
| *3.* | Разнастайнасць падыходаў, кірункаў і школ у разуменні культуры | 1,5 | 0,5 | 1 |
| *4.* | Духоўная культура і яе сутнасць. Матэрыяльная культура: крытэрыі і змест | 1,5 | 0,5 | 1 |
| *5.* | Тыпалогія культуры. Важнейшыя тыпалагічныя мадэлі культуры | 1,5 | 0,5 | 1 |
| *6.* | Культура сацыяльных супольнасцей. Спецыфіка масавай культуры | 0,5 | 0,5 | |
| *7.* | Дынаміка культуры | 1,5 | 0,5 | 1 |
| *8.* | Культура і цывілізацыя | 0,5 | 0,5 | |
| **Раздзел ІІ. Гісторыя культуры** | | | | |
| *9.* | Культура першабытнага грамадства | 0,5 | 0,5 | |
| *10.* | Культура старажытных усходніх цывілізацый. Культура Старажытнага Егіпта | 1 | 0,5 | 0,5 |
| *11.* | Культура Старажытнага Кітая і Старажытнай Індыі | 1 | 0,5 | 0,5 |
| *12.* | Культура Старажытнай Грэцыі і Рыма | 1 | 0,5 | 0,5 |
| *13.* | Еўрапейская культура эпохі Сярэднявечча | 1 | 0,5 | 0,5 |
| *14.* | Культура эпохі Адраджэння і Рэфармацыі | 1 | 0,5 | 0,5 |
| *15.* | Культура Новага часу | 1 | 0,5 | 0,5 |
| *16.* | Сацыядынаміка еўрапейскай культуры ХХ – пачатку ХХІ ст. | 1,5 | 0,5 | 1 |
| **Разам…** | | **16** | **8** | **8** |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*

*Махлина, С. Т.* Семиотика культуры повседневности: учебник для вузов / С. Т. Махлина. – 2-е изд., доп. – Москва: Издательство Юрайт, 2020. – 255 с.

*Оганов, А. А.* Теория культуры [Электронный ресурс] : учебное пособие / А. А. Оганов, И. Г. Хангельдиева. — 6-е, стер. — Санкт-Петербург : Планета музыки, 2020. — 560 с. — ISBN 978-5-8114-6449-4. — Режим доступа. – Дата доступа: 27.04.2022.

*Семилет, Т.А.* Исследования культуры в современном мире: учебное пособие для бакалавриата и магистратуры / Т. А. Семилет. - 2-е изд., испр. и доп. – Москва: Юрайт, 2019. – 137.

*Смолік, А. І.* Культуралогія: гісторыя культуры : вучэбны дапаможнік для студэнтаў ВНУ па культуралагічных і мастацтвазнаўчых спецыяльнасцях / А. І. Смолік, Л. К. Кухто, А. А. Цобкала ; [сярод рэц.: І. В. Марозаў]. – Мінск : [б. в.], 2009. – 310 с.

*Смолік, А. І.* Культуралогія: тэорыя культуры: вучэбны дапаможнік для студэнтаў вну / А. І. Смолік, Л. К. Кухто ; [рэцэнзенты: Э. К. Дарашэвіч, І. В. Марозаў]. – Мінск : [б. в.], 2008. – 279 с.

*Шапинская, Е.Н.* Массовая культура: учебник для вузов / Е. Н. Шапинская. - 2-е изд., испр. и доп.– Москва: Юрайт, 2020. – 249 с.

### Дадатковая літаратура

*Гуревич, А. Я.* Средневековый мир: культура безмолвствующего большинства / А. Я. Гуревич. – М.: Искусство, 1990. – 396 с.

*Гуревич, П.С.* Культурология / П.С. Гуревич. – М.: Знание, 1994. – 288 с.

*Данилевский, Н.Г.* Россия и Европа. Взгляд на культурные и политические отношения славянского мира к германо-романскому / Н.Г. Данилевский. – М.: Книга, 1991. – 574 с.

*Игнатович, П.Г.* Этнические основания культуры / П.Г. Игнатович, Ю. В. Чернявская. – Мн.: Технопринт, 2001. – 100 с.

*Иконникова, С.Н.* История культурологии. Идеи и судьбы / С.Н. Иконникова. – СПб.: Санкт-Петербург. гос. академия культуры, 1996. – 264 с.

История и теория культуры: учебное пособие для академического бакалавриата / В. П. Большаков, К. Ф. Завершинский, Л. Ф. Новицкая; под

общ. ред. В. П. Большакова. – 2-е изд., перераб. и доп. – М.: Издательство Юрайт, 2018. – 289 с.

*Каган, М. С.* Философская теория ценностей / М. С. Каган. – СПб.: Петрополис, 1997. – 205 с.

*Камю, А.* Бунтующий человек / А. Камю. – М.: Политиздат, 1990. – 415с.

*Культурология*: хрестоматия / сост. проф. П.С.Гурвич. – М.: Гардарики, 2000. – 592 с.

*Кармин, А.С.* Культурология / А. С. Кармин. – СПб.: Питер, 2001. – 464 с.

*Лосев, А. Ф.* Эстетика Возрождения / А. Ф. Лосев. – М.: Мысль, 1982. – 623 с.

*Лыч, Л.* Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мн.: Экаперспектыва, 1996. – 453 с.

*Мартынов, В.Ф.* Культурология. Теория культуры: учеб. пособие / В.Ф. Мартынов. – Мн.: АСАР, 2008. – 848 с.

*Назаретян, А.П.* Взаимодействие культур и социумов в контексте всемирной истории / А.П. Назаретян. − М.: ЛКИ, 2007. – 256 с.

*Ортега-и-Гассет, Х.* Восстание масс / Х. Ортега-и-Гассет // Х. Ортега-и-Гассет. Избранные труды. – М.: Весь мир, 2000. – 704 с.

*Почепцов, Г.Г.* Теория коммуникаций / Г.Г. Почепцов. – М.: Релф-бук, 2001. – 656 с.

*Смолік, А. І.* Культуралогія: тэорыя культуры: вучэбна-метадычны комплекс / А.І. Смолік, Л.К. Кухто, С.Л. Шпарло; Мін-во культуры Республікі Беларусь; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2017. – 343 с.

*Смолік, А.І.* Культуралогія : гісторыя культуры : вучэбна-метадычны комплекс / А. І. Смолік, В. М. Сакалова, Л. К. Кухто; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск: БДУКМ, 2019. – 352 с.

*Сорокин, П.А.* Человек. Цивилизация. Общество / П.А. Сорокин. – М.: Политиздат.,1992. – 544 с.

*Тайлор, Э.Б.* Первобытная культура / Э.Б. Тайлор. – М.: Наука, 1989. – 612 с.

*Тойнби, А.Дж.* Постижение истории / А.Дж. Тойнби. – М.: Прогресс, 1991. – 640 с.

*Тоффлер, Э.* Третья волна / Э. Тоффлер. – М.: АСТ, 2002. – 776 с.

*Уайт, Л.* Избранное: наука о культуре / Л. Уайт. – М.: РОССПЭН, 2004. – 960 с.

*Флиер, А.* Культурология для культурологов / А.Флиер. – М.: Академический проект, 2000. – 492 с.

*Фукуяма*, Ф. Наше постчеловеческое будущее*:* Последствия биотехнологической революции */* Ф. Фукуяма*; Пер. с англ.* М.*Б. Левина* - М.*: ООО Издательство* АСТ*: ОАО* «ЛЮКС»*.* 2004. *– 349 с.*

*Фрейд, З.* Психоаналитические этюды / З. Фрейд. – М.: АСТ, 2004. – 220 с.

*Фромм, Э.* Человек для себя. Иметь или быть? / Э. Фромм. – Мн.: Коллегиум, 1997. – 253 с.

*Хантингтон, С.* Столкновение цивилизаций / С. Хантингтон. – М.: АСТ, 2003. – 603 с.

*Хёйзинга, Й.* Осень средневековья / Й. Хёйзинга. – М.: Наука, 1988. – 544 с.

*Хрестоматия* по истории мировой культуры / Под редакцией Г.В. Гриненко. − 3-е изд., перераб. и доп. − М.: Высшее образование, 2005. − 940 с.

*Юнг, К.-Г.* Психология бессознательного / К.-Г. Юнг. – М.: Канон, 1994. – 320 с.

*Ясперс, К.* Смысл и назначение истории / К. Ясперс. – М.: Политиздат, 1991. – 528 с.

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

У якасці аднаго з элементаў, рэкамендуемага для выяўлення ўзроўню вучэбных дасягненняў студэнта, выкарыстоўваюцца крытэрыяльна-арыентаваныя тэсты. Яны ўяўляюць сабой сукупнасць тэставых заданняў закрытай формы з адным або некалькімі варыянтамі правільных адказаў; заданняў на ўстанаўленне адпаведнасці паміж элементамі двух мностваў з адным або некалькімі суадносінамі і роўнай або рознай колькасцю элементаў у мноствах; заданняў адкрытай формы з фармалізаваным адказам; заданняў на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці.

Для вымярэння ступені адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарту таксама рэкамендуецца выкарыстоўваць праблемныя, творчыя задачы, якія прадугледжваюць эўрыстычную дзейнасць і нефармалізаваны адказ.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў накіравана на паглыбленне ведаў па дадзенай вучэбнай дысцыпліне і падахвочванне студэнтаў да матывацыйнай вучэбнай дзейнасці і ўсебаковаму засваенню навучальнага матэрыялу. Самастойная праца ўключае наступныя формы:

– падрыхтоўка да семінарскіх і практычных заняткаў;

– вывучэнне падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў з прапанаванага спіса і самастойны пошук крыніц;

– вывучэнне нарматыўна-прававых актаў і даведачнай літаратуры па тэмах дысцыпліны;

– самастойнае азнаямленне з міжнароднымі нарматыўна-прававымі актамі;

– напісанне тэматычных дакладаў, рэфератаў па праблемных тэмах;

– стварэнне наглядных электронных прэзентацый па вывучаемых тэмах;

– заняткі ў бібліяграфічным аддзеле бібліятэкі па зборы матэрыялаў для дыскусій, дэбатаў, напісання эсэ і г.д.

Для ацэнкі якасці самастойнай работы студэнтаў ажыццяўляецца кантроль за яе выкананнем. Формы кантролю самастойнай працы: праверка індывідуальных заданняў і пісьмовых тэкстаў, кансультаванне студэнтаў па стварэнні мультымедыйных прэзентацый і выбары матэрыялу для эсэ.